# ПАД АБАРОНАЙ ПАВЕТРАНЫХ АСАЎ

## Чым жыве 50-я змешаная авіяцыйная база і якія задачы ўскладзены на лётны састаў?

**Гарадскі пасёлак Мачулішчы, які знаходзіцца недалёка ад Мінска, у народзе даўно лічыцца ваенным. І хоць жыхарамі населенага пункта з'яўляюцца не толькі людзі ў пагонах, суседства з праслаўленым воінскім злучэннем — 50-й змешанай ордэна Чырвонай Зоркі авіяцыйнай базай — замацавала за пасёлкам неафіцыйны статус лётнага гарадка. Тут даўно прызвычаіліся да гулу матораў і лопасцяў вінтакрылых машын. Аднак, як ні дзіўна, жыхары Мачулішчаў спяць спакойна: яны, як ніхто ведаюць, што неба над Беларуссю знаходзіцца пад пільнай увагай і надзейнай абаронай прафесіяналаў.**



Камандзір 50-й змешанай авіяцыйнай базы палкоўнік Уладзімір СКОРКІН.

### Народжаная Афганам

Напярэдадні Дня Ваенна-паветраных сіл карэспандэнты «Звязды» наведалі праслаўленае злучэнне, якое ў наступным годзе адзначыць сваё 45-годдзе. Дарэчы, гісторыя стварэння воінскай часці шчыльна звязана з падзеямі ў Афганістане. З мэтай аказання інтэрнацыянальнай дапамогі афганскаму народу ў пачатку 1980 года на тэрыторыі Узбекскай ССР быў сфарміраваны 50-ы асобны змешаны авіяцыйны полк. Адзіны з усіх авіяцыйных часцей, якія бралі ўдзел у баявых дзеяннях у Афганістане. За паспяховае выкананне заданняў па аказанні інтэрнацыянальнай дапамогі і высокія паказчыкі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы авіяполк быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

У Афганістане лётчыкі злучэння здзейснілі 120 944 баявыя вылеты, у ходзе якіх было знішчана каля 3,5 тысячы душманаў, 298 апорных пунктаў, 236 лагераў мяцежнікаў і крэпасцяў, 160 агнявых кропак, 104 пазіцыі ворага, 75 складоў са зброяй і боепрыпасамі, перавезена 90 тысяч тон грузаў, каля 700 тысяч чалавек. Баявымі ўзнагародамі і медалямі былі ўзнагароджаны 4133 ваеннаслужачыя авіяпалка, восем з іх былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Новая старонка ў гісторыі воінскай часці пачалася ў маі 1989 года, калі авіяполк быў перабазіраваны ў Беларусь, на аэрадром «Ліпкі». У маі 1994 года злучэнне перадыслакавалася на аэрадром «Мачулішчы» і атрымала новую назву — 50-й авіяцыйнай базы. Прыстаўка «змешаная» ў воінскай часці з'явілася ў жніўні 2022 года.

### Адказная місія і шлях да першакласнасці

Сёння 50-я змешаная авіяцыйная база — гэта не толькі аэрадром і ўся неабходная інфраструктура, якая забяспечвае выкананне пастаўленых задач, але і унікальны лётны цэнтр, дзе ажыццяўляецца бесперапынная падрыхтоўка асабовага складу. Тут лётчыкі і іншыя спецыялісты, без якіх нельга ўявіць ні адзін палёт, праводзяць большую частку свайго часу. На тэрыторыі воінскай часці лётчыкі харчуюцца, удасканальваюць сваю фізічную форму, шануюць традыцыі сваіх папярэднікаў — на тэрыторыі базы, у сапраўдным самалёце, размяшчаецца унікальны музей. Ёсць і Алея Герояў, і нават свая капліца. Усё зроблена для таго, каб вялікай лётнай сям'і служылася максімальна камфортна.

У першую чаргу аб гэтым клапоціцца **камандзір 50-й змешанай авіяцыйнай базы палкоўнік Уладзімір СКОРКІН.** Як сапраўдны гаспадар, ён гасцінна сустракае журналістаў і адразу ўводзіць у курс справы.

50-я авіябаза — адзінае злучэнне Узброеных Сіл нашай краіны, дзе канцэнтруецца ўся транспартная ваенная авіяцыя. Адпаведна на воінскае злучэнне ўскладзены сур'ёзныя задачы. Людзі, якія тут служаць, нясуць баявое дзяжурства па абароне паветраных рубяжоў нашай краіны, забяспечваюць высокую мабільнасць войск, выконваюць перамяшчэнне грузаў, удзельнічаюць у пошукава-ратавальных аперацыях, ажыццяўляюць падрыхтоўку лётнага саставу.

Транспартныя задачы, якія выконваюцца ваеннаслужачымі воінскай часці, нярэдка выходзяць на міждзяржаўны ўзровень. Менавіта лётчыкі 50-й авіябазы дастаўлялі гуманітарныя грузы нашым кітайскім сябрам, якія першымі сутыкнуліся з пандэміяй COVID-19. Яны ж прывезлі кітайскую вакцыну ад каранавіруснай інфекцыі беларусам. Калі ў Турцыі і Сірыі здарылася землетрасенне, ваенныя авіятары дастаўлялі ў пацярпелыя раёны нашых ратавальнікаў і урачоў. І гэта толькі малая кропля вялікай гуманітарнай місіі лётчыкаў у пагонах.

«Дзяжурствы, дзяжурствы і яшчэ раз дзяжурствы — розная ступені гатоўнасці, — кажа аб прыярытэтнай задачы, якая стаіць перад праслаўленым злучэннем, Уладзімір Скоркін. — Галоўная задача, якая стаіць перад камандзірам, — падтрыманне дасягнутага ўзроўню. Ніжэй гэтай планкі ні ў якім разе апускацца нельга. У авіяцыі няма такога: дасягнуў пэўнага ўзроўню, і на тым усё. Пастаянна ідзе працэс удасканалення лётнага саставу, якому няма мяжы. Паказчыкам удасканалення з'яўляецца класнасць кваліфікацыі. Мая мара — каб усе лётчыкі былі першага класа».

Курсанту, які прыходзіць у авіяцыю пасля заканчэння Ваеннай акадэміі, давядзецца прыкласці шмат намаганняў, каб стаць першакласным лётчыкам. Гэта не адзін год добрасумленнай службы, калі ўлічваецца і колькасць гадзін налёту, і ўзровень падрыхтоўкі. Лётчык першага класа павінен выконваць задачы ў любых метэаўмовах, і днём, і ноччу. Асобныя прафесіяналы становяцца лётчыкамі-снайперамі, а гэты статус патрабуе асаблівых намаганняў.



### На баявым дзяжурстве — сучасная тэхніка і вопытныя спецыялісты

Ваеннаслужачыя 50-й змешанай авіяцыйнай базы нясуць кругласутачнае баявое дзяжурства на тэрыторыі ўсёй краіны. У мінімальна кароткі час, і днём, і ноччу, у любых метэаўмовах лётны экіпаж гатовы вылецець і выканаць пастаўленыя задачы. Ва ўмовах рэгулярнага парушэння паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь ваенныя авіятары працуюць без прамаруджвання: падымаюцца ў неба пры любым падазрэнні на малахуткасныя лятальныя апараты. Хоць дэзынфармаваць могуць і птушкі, і метэаўтварэнні, але ў любым выпадку лётчыкі падымуцца ў неба, каб разабрацца, рэальная гэта пагроза або не.

Несці баявое дзяжурства максімальна якасна асабоваму складу дапамагае высокамабільная сучасная тэхніка. Арсенал авіябазы рэгулярна папаўняецца новымі тыпамі баявых машын. Камандзір адзначае, што верталёты, якія знаходзяцца на ўзбраенні 50-й змешанай авіяцыйнай базы, а значыць, у цэлым Узброеных Сіл, адпавядаюць задачам, якія стаяць перад айчыннай авіяцыяй. У 2017 годзе поўнасцю абнавіўся парк верталётаў Мі-8-МТВ-5. У страі — і верталёты Мі-24, восем абсалютна новых верталётаў Мі-35. У найбліжэйшы час чакаецца пастаўка яшчэ чатырох такіх верталётаў — у выніку будзе сфарміравана цэлая эскадрылля.

Па словах Уладзіміра Скоркіна, верталёт Мі-35 вельмі добра сябе зарэкамендаваў. Нягледзячы на шырокі спектр задач, які ён можа выконваць, асноўная з іх — агнявая. Пры гэтым верталёт не пераборлівы, можа ажыццявіць пасадку ў любым месцы. Увесь асабовы склад асвоіў гэты тып верталёта — адпаведную падрыхтоўку авіятары прайшлі ў Расійскай Федэрацыі.

Што датычыцца падрыхтоўкі лётчыкаў, гэта працэс бесперапынны. Вопыт ваенных канфліктаў, у тым ліку спецыяльнай ваеннай аперацыі, увесь час уносіць карэкціроўкі ў навучальны працэс. «Наладжана шчыльнае ўзаемадзеянне з авіяцыйным складнікам Расійскай Федэрацыі, праводзяцца сумесныя вучэнні, — канкрэтызуе камандзір 50-й змешанай авіябазы. — Нядаўна расійскія калегі прымалі ўдзел у парадзе ў Мінску з нагоды 80-годдзя вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, лётны састаў у тым ліку базіраваўся на аэрадроме «Мачулішчы». Гэта ўнікальная магчымасць узаемадзеяння, калі калегі напрамую маглі абмеркаваць пытанні, якія іх хвалююць, падзяліцца вопытам».

### Годная змена

Лётная прафесія па-ранейшаму застаецца папулярнай у маладых людзей. Але, як гэта было заўсёды, паступіць на авіяцыйны факультэт Ваеннай акадэміі няпроста: трэба мець першую групу здароўя і добра вучыцца. Лётчыкі — гэта штучныя кадры, а таму ўвага да маладых спецыялістаў прыкавана з курсанцкай лаўкі. Больш блізка са сваімі юнымі калегамі ваеннаслужачыя 50-й авіябазы знаёмяцца на выпускным курсе, падчас трохмесячнай практыкі. Дагэтуль курсанты авіяцыйнага факультэта стажыруюцца ў аэраклубах ДТСААФ. Па прыбыцці на практыку ў воінскі калектыў будучыя лётчыкі асвойваюць верталёты Мі-8-МТВ-5 і Мі-24. З наступнага года лейтэнанты адразу будуць вучыцца лятаць на новых Мі-35.

Здароўю авіятараў заўсёды ўдзялялася асаблівая ўвага. Добрае харчаванне, рэжым працы і адпачынку, абавязковы водпуск — за гэтым тут строга сочаць. Асартымент харчавання значна пашыраны (карэспандэнты пераканаліся падчас абеду). Раз у год праходзяць урачэбналётную камісію і раз у паўгода — паглыбленны медыцынскі агляд. Калі нешта не так са здароўем, з высокакваліфікаванымі спецыялістамі не спяшаюцца развітвацца: ваеннаслужачым прапануюць іншую работу.

Клапоцяцца тут і аб патрыятычным выхаванні моладзі. У 2022 годзе на тэрыторыі злучэння быў створаны адзін з першых ваенна-патрыятычных клубаў ва Узброеных Сілах «Сокал». Каля 180 хлопцаў і дзяўчат з Мачулішчаў і прылеглых населеных пунктаў спасцігаюць на тэрыторыі авіябазы азы ваеннай прафесіі, маюць магчымасць назіраць за службай лётчыкаў, дзякуючы ім знаёмяцца са славутасцямі Беларусі. Ваеннаслужачыя спадзяюцца, што ў будучыні хтосьці з іх юных падапечных папоўніць лётныя шэрагі.

### Любоў да неба — з дзяцінства

Без рэгулярнага кіравання баявой машынай прафесійны лётчык хутка можа страціць кваліфікацыю. Нягледзячы на вялікую колькасць задач, знаходзіць час для палётаў і камандзір 50-й змешанай авіябазы. Уладзімір Скоркін — лётчык першага класа, лётчык-інструктар — праз яго рукі праходзяць вопытныя авіятары, якія дзеляцца прафесійным майстэрствам са сваімі калегамі.

Стандартны дзень у камандзіра пачынаецца ў шэсць гадзін раніцы: пакуль афіцэр збіраецца на службу, аператыўны дзяжурны дакладвае яму па тэлефоне аб абстаноўцы за мінулую ноч. Па прыбыцці ў воінскую часць Уладзімір Скоркін аб'язджае ўсю тэрыторыю: асабіста правярае, як арганізавана ахова аэрадрома, стан аэрадрома і прылеглай тэрыторыі. У восем раніцы ён ужо ў кабінеце. Па закрытых каналах сувязі ўдакладняе стан спраў, заслухоўвае даклад аб становішчы спраў у воінскай часці, ставіць задачы на дзень. Затым кантралюецца іх выкананне, адбываецца ўзаемадзеянне з асабовым складам, ідзе працэс навучання. Камандзір паглыблены ў пытанні, якія хвалююць воінскі калектыў, робіць усё для таго, каб дапамагчы кожнаму, хто мае патрэбу. Клопаты займаюць вялікую колькасць часу і забіраюць сілы, але для чалавека, які жыве сваёй прафесіяй, гэта толькі ў радасць.

Лятаць Уладзімір Скоркін марыў з дзяцінства. Як ён сам кажа — выхаваны аэрадромам. Нарадзіўся ў Пскове, у сям'і ваеннаслужачага. Калі яму быў год, бацьку, лётчыка транспартнай авіяцыі, перавялі ў асобны полк ваенна-транспартнай авіяцыі ў Віцебск. Так Уладзімір Скоркін назаўсёды застаўся ў Беларусі, якая стала для яго другой Радзімай. У 15 гадоў будучы камандзір пачаў наведваць віцебскі аэраклуб і праз год асвоіў верталёт Мі-2. Так атрымалася, што шаснаццацігадовы школьнік-аматар вучыў тонкасцям лётнага майстэрства курсантаў Ваеннай акадэміі, якія ўпершыню прыехалі ў аэраклуб на практыку. А неўзабаве і сам паступіў на авіяцыйны факультэт галоўнай ваеннай ВНУ Беларусі.

Пасля заканчэння Ваеннай акадэміі служыў у 276-й верталётнай базе пад Полацкам, затым — у 181-й верталётнай базе ў Пружанах, дзе прайшоў шлях ад лётчыка-аператара да камандзіра эскадрыллі. У 2015 годзе база ў Пружанах была расфарміравана, і Уладзіміра накіравалі вучыцца ў Ваенную акадэмію, на камандна-штабны факультэт. У 2017-м Уладзімір Скоркін прыйшоў у 50-ю авіябазу на пасаду камандзіра эскадрыллі.

Прайшоўшы розныя ступені службовай лесвіцы, з 2022 года лётчык першага класа з'яўляецца камандзірам гэтага праслаўленага злучэння, а разам з тым — высокім прафесіяналам, руплівым гаспадаром, надзейным таварышам для калег. Як ён сам прызнаецца, у паветры не існуе званняў. Ёсць адданасць Радзіме, упэўненасць у правільнасці выканання задач, давер да сваёй каманды і любоў да прафесіі, якая з'яўляецца прызваннем.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**